**ОНА** *(перебивая)*. Святой отец, да, мы мудрее вас, но лекарство против СПИДа еще не найдено. Как жить, если ЭТО заглянет прямо в глаза – страшно и неопределенно?

**Монах.**

Я понял, голос разума для вас
Лишь ветра шум... жужжанье комара...
Вы признаете силу и приказы!

**Он.** А может, действительно, в масштабах государства издать приказ...

**Она.** О чем?

**Он.** Действительно, о чем? Что запретить? Что разрешить? Беда повсюду. Тут лишь на Бога уповать придется и на судьбу. Или страдать и умереть в расцвете лет.

**Монах.**

Как с вами объясниться сквозь столетья?
Как правду отличить от лжи и сплетен?
Когда на расстояньи двух шагов
Друзей не отличаешь от врагов?!
Лишь тот, кто существует вечно,
Поймет вас... тех, чье имя быстротечно.
Но если человек страдать так страшно может,
То как же ты страдаешь, вечный Боже?

**Она.** Где выход? Кто захочет умирать, если можно жить! Кто выдержит, если на глазах умирает друг, любимая, ребенок? А может... каждому стоит начать бороться со СПИДом в своей душе, в своем маленьком мире?

**Он.** И начинаешь понимать, что перед лицом вечности, перед лицом этой страшной болезни наша жизнь, наша душа – хрупки и нежны, словно лепестки цветов, которые легко обжечь и солнцем, и морозом.

**Она.** Так давайте же, каждый, сохраним свой цветок, цветок жизни, цветок любви. И тогда мир будет полон цветов, дарящих нам радость и возвращающих веру в чудо.

**Он.** А если цветок любви обожженный не зацветет опять?

**Она.** Тогда простить, понять и просто быть рядом. Берегите себя для тех, кого вы любите!

**Он.**

А вас, достопочтимый брат Лоренцо,
Прошу молитвою оплакать молодых.
И перед Богом попросить прощенья
За недостойных нас...

*Звучит музыка. Ведущие уходят. Монах стоит, молитвенно сложив руки и опустив голову.*

ЗАНАВЕС.

***Г. Бразюль,***
***режиссер современного досуга обрядов и празднеств, д. Видзы-Ловчинские, Браславский р-н, Витебская обл.***

# Нарматыўнае рэгуляванне папаўнення фондаў бібліятэк Беларусі айчыннай друкаванай прадукцыяй

З канца 2008 г. пачалі дзейнічаць «Палажэнне аб абавязковым бясплатным экзэмпляры дакументаў» і «Інструкцыя аб парадку ажыццяўлення ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў». Яны рэгулююць сістэму рассылкі абавязковага бясплатнага экзэмпляра і працэсы ўзаемадзеяння бібліятэк па папаўненні фондаў дакументамі, у тым ліку і нацыянальнымі. Прымяненне гэтых заканадаўчых актаў на практыцы дазволіць эфектыўна рэалізаваць перавагі ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў .

Бібліятэкам належыць важная і адказная роля па зборы, захаванні і арганізацыі выкарыстання грамадска значымых інфармацыйных рэсурсаў. Яны спрыяюць рэалізацыі канстытуцыйнага права кожнага грамадзяніна на свабодны доступ да інфармацыі. Гэта гістарычна сфарміраваны, самы распаўсюджаны і ўстойлівы сацыяльны інстытут, аб'ектам дзейнасці якога з'яўляецца тыражыраваная дакументная прадукцыя. Бібліятэка абслугоўвае практычна ўсе сацыяльныя групы грамадства, прычым на доўгатэрміновай і безвыплатнай аснове.

Камплектаванне бібліятэчных фондаў нацыянальнай паліграфічнай прадукцыяй – вельмі важны аспект інфармацыйнай палітыкі дзяржавы. Праз нацыянальны дакумент і бібліятэку як асноўную і пастаянную кропку доступу да яго здзяйсняецца арганічны ўплыў на фарміраванне ў насельніцтва грамадскіх каштоўнасцей, грамадзянскай адказнасці, патрыятызму і гонару за ўласную айчыну.

Гэта знаходзіць дзяржаўную падтрымку і замацавана ў нарматыўных актах, прынятых у апошнія гады.

У верасні 2008 г. Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь было зацверджана «Палажэнне аб абавязковым бясплатным экзэмпляры дакументаў», у якім вызначана сістэма фарміравання, размеркавання і выкарыстання нацыянальных дакументаў, якія належаць абавязковай рассылцы ў розныя дзяржаўныя структуры і ўстановы. Адной з яе асноўных мэтаў з'яўляецца камплектаванне і пастаяннае захаванне поўнага, размеркаванага паміж рознымі ўстановамі фонда дакументаў, створаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ці за яе межамі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь. Гэта спрыяе шырокаму інфармаванню грамадства і забеспячэнню доступу да нацыянальных дакументаў як часткі сусветнай культурнай спадчыны.

Вытворцам абавязковых экзэмпляраў пры гэтым гарантуецца пастаяннае захаванне іх прадукцыі, яе бібліяграфічнае адлюстраванне ў адпаведных нацыянальных і міжнародных базах даных і інш.

У «Палажэнні...» зацверджаны таксама пералік атрымальнікаў абавязковых экзэмпляраў, сярод якіх дзяржаўныя органы (Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і інш.), цэнтральныя, абласныя, занальныя дзяржаўныя архівы, Нацыянальная кніжная палата Беларусі, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь, ЦНБ НАН Беларусі імя Я. Коласа, РНТБ, РНМБ, БелСХБ, ФБ БГУ і некаторыя іншыя ўстановы. Яны маюць права на своечасовае атрыманне абавязковага экзэмпляра, пры неабходнасці, яго замену, рэпрадуктаванне і абавязаны забяспечваць яго пастаяннае захаванне. Для дзяржаўных органаў тэрмін захавання абавязковага экзэмпляра абмежаваны і заканчваецца пасля здзяйснення функцый кантроля і страты актуальнасці абавязковага экзэмпляра ў іх бягучай дзейнасці. Яны маюць права на бязвыплатную перадачу неперыядычных друкаваных выданняў у фонд унутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў.

Такі падыход быў упершыню ў нашай краіне вызначаны ў дакуменце, які рэгламентуе сістэму фарміравання і распаўсюджвання абавязковых экзэмпляраў. Ён быў успрыняты бібліятэчнай грамадскасцю як вельмі прагрэсіўны і рацыянальны. У камплекце неперыядычных друкаваных выданняў абавязковага экземпляру прадстаўлены шырокі відавы, жанравы спектр айчыннай паліграфічнай прадукцыі, прызначаны для самых розных катэгорый насельніцтва: навуковая, мастацкая, навукова-папулярная, дзіцячая і іншая літаратура, атласы, ноты, выяўленчыя выданні. Перадача іх пасля выкарыстання ў бягучай дзейнасці дзяржаўных органаў у фонд унутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў дазволіць у межах існуючага прававога поля па-гаспадарску распарадзіцца не толькі матэрыяльнымі, але і духоўнымі каштоўнасцямі. Гэта дасць магчымасць на пастаяннай аснове папаўняць фонды розных бібліятэк краіны навінкамі нацыянальнага кнігадрукавання, істотна падтрымліваць рэгіянальныя публічныя бібліятэкі, бібліятэкі ўстаноў адукацыі і інш.

Фонд унутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў існуе пры Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, якая згодна Закона Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» выконвае функцыі адпаведнага рэспубліканскага цэнтра.

Неабходна адзначыць, што да ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў заўсёды была ўвага з боку бібліятэчнай супольнасці, зацікаўленасць у яго пастаяннай падтрымцы і аптымізацыі. Невыпадкова, што Беларуская бібліятэчная асацыяцыя была ініцыятарам падрыхтоўкі нарматыўнага дакумента, які б рэгламентаваў гэты традыцыйны для бібліятэк від карпаратыўных узаемаадносін. У канцы 2008 г. пастановай Савета Міністраў (на высокім дзяржаўным узроўні) была зацверджана «Інструкцыя аб парадку ажыццяўлення ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў». Яна ўстанавіла адзіныя правілы выкарыстання сукупнага фонду бібліятэк краіны шляхам абмену і бязвыплатнай перадачы дакументаў у бібліятэкі, інфармацыйныя цэнтры і іншыя ўстановы. Адначасова ў бібліятэках прадугледжваецца стварэнне адпаведных умоў і функцыянаванне ўпаўнаважаных структур (асобных супрацоўнікаў), якія на прафесійным узроўні займаюцца гэтай дзейнасцю.

НББ як цэнтр унутрырэспубліканскага дакументаабмена і пераразмеркавання дакументаў аказвае істотную дапамогу бібліятэкам краіны па камплектаванні іх фондаў, асабліва гэта важна ва ўмовах праблем фінансавання. На працягу 1-га паўгоддзя 2009 г. у іх фонды было накіравана амаль 50 тыс. экз. дакументаў. Пры гэтым бібліятэкам сістэмы Міністэрства культуры перададзена 34,4% ад агульнай колькасці, бібліятэкам сістэмы Міністэрства адукацыі – 26,1%, бібліятэкам сістэмы Міністэрства абароны РБ – 13,9%, рэспубліканскім навуковым бібліятэкам – 20,5%, бібліятэкам устаноў сацыяльнага тыпу перададзена 5,1%. Відавочна, што такая дзейнасць мае гуманітарны характар і арганічна ўпісваецца ў сацыяльную скіраванасць палітыкі нашай дзяржавы. Яна ўносіць істотны ўклад у развіццё бібліятэчных фондаў устаноў адукацыі, сацыяльнай абароны, музеяў, вайсковых, пенітэнцыярных і іншых устаноў. У межах выканання Дзяржаўнай праграмы па адраджэнні і развіцці вёскі на 2005–2010 гг. асаблівая ўвага надаецца падтрымцы сельскіх бібліятэк і бібліятэк аграгарадкоў: толькі за першую палову 2009 г. літаратура з фонду ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання была накіравана ў 40 такіх бібліятэк.

Паспяховая і плённая рэалізацыя механізмаў унутрырэспубліканскага абмену і пераразмеркавання дакументаў немагчыма без існуючага дзесяткі гадоў адпаведнага фонду. Ён з'яўляецца службовым

(дапаможным) фондам НББ. Агульны аб'ём гэтага фонду набліжаецца да 100 тыс. адзінак захоўвання. Фонд універсальны па змесце, ён уключае дакументы, якія маюць інфармацыйную, навуковую, грамадскую значнасць, мастацкую каштоўнасць. Утрымліваюцца выданні на розных мовах, створаныя ў канцы XIX – пачатку XXI ст. Гэта выданні Расійскай Федэрацыі і іншых краін СНД, краін дальняга замежжа. Найбольш поўна па рэпертуары прадстаўлена друкаваная прадукцыя беларускіх паліграфічных прадпрыемстваў.

Трэба сказаць, што адной з асноўных характарыстык падобных фондаў з'яўляецца іх рухомасць. Чым актыўней дакументы перадаюцца ў іншыя бібліятэкі, а ў фонды паступаюць новыя, тым больш эфектыўна іх выкарыстанне. Гэта здзяйсняецца пры дапамозе аператыўнага інфармавання бібліятэк аб выданнях, наяўных у фондзе ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання (на партале НББ рэгулярна выстаўляюцца новыя выпускі адпаведнага «Паказальніка літаратуры...»), праз шматлікія галіновыя спісы, якія ўключаюць інфармацыю аб дакументах за мінулыя гады, а таксама па разавых тэматычных запытах бібліятэк-партнёраў. Толькі за першыя шэсць месяцаў 2009 г. у фонд было накіравана 42 тыс. экземпляраў дакументаў.

Асаблівым клопатам супрацоўнікаў НББ з'яўляецца як колькаснае, так і якаснае развіццё гэтага фонда. Яго папаўненне адбываецца з унутраных і знешніх крыніц: у выніку выключэння дакументаў з дзеючых фондаў НББ, бязвыплатнай перадачы выданняў розных айчынных і замежных устаноў, ахвяраванняў прыватных асоб.

Істотную дапамогу аказваюць амбасады і прадстаўніцтвы розных замежных краін, урадавыя структуры г. Масквы, Асацыяцыя расійскіх выдаўцоў, асобныя замежныя выдавецкія ўстановы. Айчынныя выданні звычайна прыносяць ці дасылаюць аўтары, чытачы НББ. Але, на жаль, да сённяшняга часу недастаткова эфектыўна выкарыстоўваецца такая крыніца папаўнення фонду, як абавязковы бясплатны экзэмпляр, які страціў актуальнасць пасля здзяйснення функцый кантролю дзяржаўнымі органамі. Практыка сведчыць аб тым, што толькі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь рэгулярна перадае ў НББ значную частку атрымліваемых ім абавязковых экземпляраў розных відаў друкаванай прадукцыі беларускіх паліграфічных прадпрыемстваў. Больш за 90% нацыянальных дакументаў, якія ў апошнія гады пераразмяркоўваюцца з НББ у фонды іншых беларускіх бібліятэк, паступілі менавіта ад Міністэрства інфармацыі. Гэта істотная падтрымка развіцця бібліятэчнай справы краіны.

Відавочна, што ўнутрырэспубліканскі дакументаабмен і пераразмеркаванне дакументаў з'яўляецца сацыяльна значымым накірункам супрацоўніцтва бібліятэк. Гэта надзейны канал эканамічна выгаднага камплектавання бібліятэчных фондаў. Ён спрыяе рацыянальнаму выкарыстанню сукупнага бібліятэчнага фонду краіны, рэалізацыі рэспубліканскіх сацыяльных праграм па развіццю духоўных каштоўнасцей насельніцтва і міжнароднаму супрацоўніцтву па ўмацаванні культурных сувязей з замежнымі беларускімі суполкамі.

Для яго эфектыўнага функцыянавання зроблена нямала: створана юрыдычная аснова, усталяваны практычныя механізмы. Бібліятэкі краіны робяць усё неабходнае для таго, каб мэтанакіраваная работа па зборы, захаванні нацыянальнага дакумента і прадзвіжэнню яго да шырокага кола карыстальнікаў краіны адпавядала сучасным патрабаванням. Для актывізацыі гэтай дзейнасці вельмі важна пашырэнне каналаў папаўнення фонду ўнутрырэспубліканскага абмену і пераразмеркавання дакументаў, найперш, бясплатным абавязковым экземплярам айчыннай паліграфічнай прадукцыі. Зацікаўленасць у гэтым і ўвага з боку ўладных структур і шырокай грамадскасці мае стратэгічнае значэнне. Кожны створаны ў краіне дакумент павінен выкарыстоўвацца максімальна эфектыўна і доўгатэрмінова.

***Тацяна Кузьміч,***
***Алена Сівакова,***
***Нацыянальная бібліятэка Беларусі***

### З «Інструкцыі аб парадку ажыццяўлення ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў», зацверджанай Пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 31.12.2008 г.

*(Поўны тэкст надрукаваны www.pravo.by)*

3. Дакументаабмен і пераразмеркаванне дакументаў з'яўляюцца накірункамі карпаратыўнага ўзаемадзеяння бібліятэк і іншых інфармацыйных арганізацый па фарміраванні і развіцці сукупнага бібліятэчнага фонду Рэспублікі Беларусь і ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з сапраўднай Інструкцыяй, іншымі актамі заканадаўства.

4. Ажыццяўляць дакументаабмен могуць бібліятэкі і іншыя ўстановы Рэспублікі Беларусь незалежна ад іх ведамаснай падпарадкаванасці і формаў уласнасці.

5. Дакументаабмен і пераразмеркаванне дакументаў арганізуюцца па тэрытарыяльным і тэрытарыяльна-галіновым прынцыпах у межах краіны ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь», дзеючымі дзяржаўнымі стандартамі і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі.

6. Дакументаабмен і пераразмеркаванне дакументаў ажыццяўляюцца з выкарыстаннем абменных фондаў бібліятэк у адпаведнасці з пісьмовымі дамовамі (пагадненнямі), пісьмамі.

7. Мэтай дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў з'яўляецца аптымальнае размеркаванне сукупнага бібліятэчнага фонду краіны, а таксама ра-

цыянальнае выкарыстанне бясплатных крыніц камплектавання.

8. Задачамі дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў з'яўляюцца:

– пазбаўленне бібліятэчных фондаў ад няпрофільных, празмерна дублетных дакументаў;

– папаўненне фондаў бібліятэк неабходнымі айчыннымі і замежнымі дакументамі шляхам абмену і пераразмеркавання дакументаў.

9. У бібліятэках, якія ажыццяўляюць дакументаабмен і ўнутрырэспубліканскае пераразмеркаванне дакументаў, прадугледжваюцца:

– функцыянаванне асобнага структурнага падраздзялення, вызначэнне асобных штатных адзінак, адказных за выкананне адпаведных абавязкаў, з іх замацаваннем у службовых інструкцыях;

– выдзяленне асобнага памяшкання (часткі памяшкання) для размяшчэння абменнага фонду і работы з ім.

10. Абменныя фонды ўваходзяць у сістэму фондаў бібліятэкі, якая іх фарміруе, і з'яўляюцца іх дапаможнай (службовай) часткай.

11. Абменныя фонды фарміруюцца з празмерна дублетных, няпрофільных для пэўнай бібліятэкі дакументаў, якія паступілі:

– пасля выключэння (спісання) дакументаў з дзеючых фондаў;

– у якасці падарункаў і ахвяраванняў ад арганізацый і прыватных асоб.

12. З асноўных фондаў бібліятэк у абменныя фонды накіроўваюцца толькі тыя дакументы, якія выключаны з форм індывідуальнага ўліку і зняты з балансу.

13. Тэхналогія ўліку абменных фондаў вызначаецца кожнай бібліятэкай самастойна ў адпаведнасці з заканадаўствам.

14. Даныя аб арганізацыі абменных фондаў, іх папаўненні і руху падлягаюць пастаяннай і своечасовай фіксацыі ў акт-пуцёўках, картатэках, базах даных, актах і іншых уліковых формах, прынятых у пэўнай бібліятэцы.

15. Для ўзаемнага інфармавання аб складзе абменных фондаў бібліятэкі рэгулярна фарміруюць і распаўсюджваюць (у тым ліку і па электронных каналах) спісы (паказальнікі, пералікі) дакументаў, прызначаных для дакументаабмену і пераразмеркавання.

16. Дакументаабмен і пераразмеркаванне дакументаў можа здзяйсняцца на пастаяннай аснове і па разавых запытах. Адпаведна афармляюцца доўгатэрміновыя дамовы (пагадненні) або пісьмы.

17. Працэсы дакументаабмену, пераразмеркавання дакументаў афармляюцца адпаведнымі актамі, якія складаюцца ў двух экземплярах і дапаўняюцца спісамі (пералікамі) перадаваемых дакументаў. Акты завяраюцца подпісамі супрацоўнікаў, адказных за перадачу-прыём дакументаў, і зацвярджаюцца кіраўнікамі (упаўнаважанымі асобамі) бібліятэк.

Занятие для 7 класса

# От поиска к познанию



## «Справочная литература: энциклопедии универсальные и отраслевые, справочники и словари»

**Цель:** познакомить со справочной литературой, заинтересовать учащихся и научить ею пользоваться.

**Задачи:** закрепить знания, полученные на библиотечных занятиях; выработать умение пользоваться энциклопедиями и словарями; воспитывать бережное отношение к книгам; расширить кругозор читателей.

**Форма проведения:** деловая игра-поиск, мультимедийная презентация.

**Оборудование:** энциклопедии, словари, компьютер.

### Разминка

1.Какие энциклопедии вы знаете?

«Я познаю мир», «Все обо всех», «Мир живой природы», «Всемирная история для детей».

2. Какие словари вам уже известны?

Толковый словарь, орфографический словарь, переводные словари.

### Основная часть

*(Слайд №1, на котором изображен ребенок и вопросительные знаки.)*

Есть хорошее слово – «почему?» С него начинается всякое открытие. Быть «почемучкой» похвально: всякая наука начинается с «почему». Вы еще школьники, и каждое «почему» помогает вам развиваться и познавать мир, открывать его «тайны».

*(Слайд №2: веселое лицо ребенка.)*

Льется с неба синий цвет.
И конца у неба нет...
Отчего оно такое?
Кто мне сможет дать ответ?
Где ложится ветер спать?
Можно ль молнию поймать?
До чего же интересно
Все на свете узнавать!

Какие «очень умные книги» помогут вам ответить на все ваши вопросы?

*(Ответы детей.)*